**УДК 811.161.3'373.211(476.6+476.2+476.5-25):355.48"1945"** **DOI 10.52928/2070-1608-2025-76-4-82-86**

# АСАБЛІВАСЦІ ЭКСПЛІКАЦЫІ ВЫНІКАЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ ВА ЎРБАНАНІМІКОНАХ СЯРЭДНІХ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ

***д-р філал. навук, праф. Г.М. МЕЗЕНКА***
***(Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-5192-767X***
***e-mail: mezenka1@yandex.ru***

*Да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў артыкуле адлюстраваны вынікі супастаўляльнага вывучэння ўрбананіміконаў сярэдніх і буйных беларускіх гарадоў – Ліды, абранай пляцоўкай для святкавання Дня беларускага пісьменства ў 2025 г., Мазыра, Віцебска. Устаноўлены тры з сямі агульныя для аналізаваных урбананіміконаў трох гарадоў тэматычныя групы намінацыйных адзінак – назвы ўнутрыгарадскіх лінейных і тэрытарыяльных аб’ектаў, дадзеныя ў гонар радавых удзельнікаў вайны, герояў бітваў і ахвяр; асоб вышэйшага каманднага складу; войскаў, аб'яднанняў і фарміраванняў. Вызначана, што кожнаму ўрбананімікону ўласцівыя свае суадносіны паміж назвамі, што эксплікуюць вынікі Вялікай Айчыннай вайны; пры гэтым сярэднія па колькасці насельніцтва гарады характарызуюцца значна большым працэнтам назваў аналізаваных груп (у Мазыры – 25,5%, або 41; у Лідзе – 16,6%, або 61) у параўнанні з буйным (у Віцебску – 7,4%, або 73), што сведчыць пра перавагу ў намінацыйнай практыцы гэтага разраду гарадоў рэгіянальнага складніка над агульнанацыянальным.*

***Ключавыя словы**: буйны / сярэдні горад, Вялікая Айчынная вайна, Віцебск, Ліда, Мазыр, унутрыгарадская назва, урбананімікон.*

**Уводзіны**. На пачатку XXI ст. анамастыка і ў тым ліку ўрбананіміка, якая даследуе ўнутрыгарадскія назвы рэгіёнаў, ператвараецца ў асобны напрамак анамастычных даследаванняў, а ўрбанонімы ўсё часцей пачынаюць разглядацца як асобны параметр рэгіянальнай ідэнтычнасці, што прадыктавана ўласцівасцю ўласных імёнаў захоўваць і трансліраваць значную гістарычную, этнаграфічную і культурную інфармацыю, адлюстроўваць асаблівасці нацыянальнага светаўспрымання. Урбананіміконы акумулююць рысы вызначанага часу і пэўнага рэгіёну, запатрабаванняў і інтарэсаў жыхароў гэтай мясцовасці, якія ўвасабляюцца ў найменнях аб’ектаў. Кожнаму гораду ўласцівы свой непаўторны ўрбананімікон, які рэпрэзентуе ўнікальную культурную, сацыяльную і этнічную сістэмы паселішча, і, адпаведна, з’яўляецца своеасаблівым варыянтам агульнанацыяльнай сукупнасці назваў унутрыгарадскіх аб’ектаў. Вопыт аналізу ўрбананімных сістэм беларускіх, расійскіх, польскіх, балгарскіх гарадоў дэманструе наяўнасць пэўнай розніцы паміж варыянтамі ўрбананіміконаў розных па памеры гарадоў – буйных, з аднаго боку, сэрэдніх і малых – з другога, дзе адчуваецца значны ўплыў на намінатараў унутрыгарадскіх аб’ектаў падзей і абставін мясцовай гісторыі.

Адзначанае адносіцца і да мемаратыўных практык – свядомых сацыяльных актаў перадачы маральна і светапоглядна значнай інфармацыі шляхам увекавечання пэўных асоб і падзей Другой сусветнай, а для беларусаў і расіян – Вялікай Айчыннай вайны.

Дынаміка глабалізацыйных працэсаў, якія спрыяюць размыццю або сціранню межаў у розных сферах дзейнасці чалавека, у першую чаргу, у галіне культуры і нацыянальнай ідэнтычнасці, працуе на абвастрэнне праблемы нестабільнасці, цэласнасці грамадства. Гэта “прымушае зірнуць на пазначаныя працэсы праз прызму гістарычнай памяці, культурных традыцый, мемаратыўных практык і іх ролі ў захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці і зніжэння сацыяльнай напружанасці ва ўмовах глабалізацыі” [1, с. 17] і робіць вывучэнне падыходаў да рэпрэзентацыі вынікаў Вялікай Айчыннай вайны ва ўрбананіміконах гарадоў розных тыпаў вельмі актуальным.

Мэта даследавання – выяўленне асаблівасцей эксплікацыі вынікаў Вялікай Айчыннай вайны ва ўрбананімных сістэмах сярэдніх гарадоў Беларусі.

**Асноўная частка.** Унутрыгарадскія назвы, звязаныя з прозвішчамі ўдзельнікаў і назвамі падзей Вялікай Айчыннай вайны, даследаваліся беларускімі, расійскімі і польскімі анамастамі. Так, асаблівасці адлюстравання гістарычнай памяці ва ўрбананімных мемаратывах апісаны ў навуковых працах М.Л. Дарафеенка [2; 3]; функцыя трансляцыі гістарычнай памяці пра падзеі 1941–1945 гг. аналізавалася ў нашых публікацыях [4]. Разглядаючы гераічную ўрбананімію Варонежскай вобласці, па тэрыторыі якой з канца чэрвеня 1942 г. да канца студзеня 1943 г. праходзіла лінія фронту, С.А. Папоў прыходзіць да высновы аб неабходнасці захавання памяці пра герояў у тапонімах [5]; пра напрамкі мемарыялізацыі ў малым расійскім горадзе распавядае А.В. Савіна [6]; аналізу тапонімаў, якія сустракаюцца ў раённай прэсе перыяду Вялікай Айчыннай вайны, прысвечаны артыкул Н.А. Красоўскай [7]; уплыў помнікаў, размешчаных на аднайменных гадонімах, на гістарычную памяць гараджан цікавіць А.А. Арлову [8]. Пра дэкамунізацыю назваў вуліц у Польшчы і ролю перайменавання гарадской тапаніміі як сродка перавызначэння мясцовай ідэнтычнасці сведчыць публікацыя Б. Ружыцкага [9]. З поглядам маладых даследчыкаў на Другую сусветную вайну ў гістарычнай памяці рускіх і палякаў знаёміць артыкул расійскіх і польскіх вучоных В.Н. Барысенка, Я. Венглаж, Т.Н. Ганчаровай [10].

Яшчэ адзін напрамак навуковых пошукаў вырашае задачы супастаўляльнага аналізу ўрбананіміконаў розных гарадоў. Напрыклад, супастаўленне архітэктурных арыенціраў ва ўрбананімнай прасторы Беларусі і Францыі праводзіла М.Л. Дарафеенка [11], прадстаўленасць і вектары развіцця рэгіянальнага анамастыкону ў беларускіх лексікаграфічных выданнях аналізаваліся намі [12].

Варта заўважыць, што, абумоўленыя больш высокімі фрэквентатыўнымі паказчыкамі, унутрыгарадскія найменні буйных гарадоў часцей становяцца аб'ектамі вывучэння. Што да ўрбананіміконаў сярэдніх гарадоў, то яны, паводле вынікаў аналізу навукоўцаў, значна радзей падвяргаліся вывучэнню. Параўнальнае даследаванне ўрбананіміі буйных і сярэдніх гарадоў Беларусі, звязанай з асобамі і падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, пакуль не ажыццяўлялася.

Пачынаючы пошукі рашэння праблемы, неабходна яшчэ раз падкрэсліць, што ў сацыяльных рэаліях, якія сфарміраваліся на працягу 80-ці гадоў пасля Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, асаблівую значнасць набыла задача захавання гістарычнай памяці пра вынікі гэтай вайны. Аб’ектам вывучэння сталі ўрбананіміконы двух сярэдніх беларускіх гарадоў – Ліды (колькасць насельніцтва – 103 262 чал.), абранай у гэтым годзе пляцоўкай для святкавання Дня беларускага пісьменства, і Мазыра (кольк. насельн. – 111 377 чал.), якія характарызуюцца супрацьлеглым геаграфічным становішчам; для супастаўлення таксама буйнога горада Віцебска (кольк. насельн. – 358 927 чал.) [13]. Матэрыял для даследавання склала практыка намінацыі лінейных і тэрытарыяльных унутрыгарадскіх аб'ектаў у пералічаных гарадах. Аналіз праводзіцца з выкарыстаннем прыёмаў збору, апрацоўкі і інтэрпрэтацыі матэрыялу, якія прадстаўляюць дэскрыптыўны метад, параўнальна-супастаўляльнага і элементаў статыстычнага метаду.

Як паказвае сучасная намінатыўная практыка, колькасць назваў унутрыгарадскіх лінейных аб’ектаў у гонар асоб і падзей Вялікай Айчыннай вайны ва ўрбананіміконах пэўным чынам залежыць ад памераў горада. У прыватнасці, гэта выяўляецца пры супастаўленні ўрбананіміконаў сярэдніх і буйных гарадоў. Крытэрам аднясення гарадскіх паселішчаў да той ці іншай групы з’яўляецца колькасць гарадскога насельніцтва.

У першых класіфікацыях гарадоў, якія служылі мэтам эканамічнага размеркавання, у прыватнасці, вядомай працы В.П. Сямёнава-Цян-Шанскага [14], да ліку сярэдніх гарадоў адносіліся паселішчы з лікам жыхароў 10–40 тыс. Апошнія 50 гадоў, пачынаючы з працы Б.С. Хорава, у якой прапанавана выкарыстоўваць двухступеньчатую класіфікацыю сярэдніх гарадоў (1) паўсярэднія гарады (20–50 тыс.); 2) сярэднія (50–100 тыс.) [15]), больш прынятай лічыцца класіфікацыя, у адпаведнасці з якой да ліку сярэдніх адносяць гарады з насельніцтвам ад 50 да 100 тыс. [16, с. 17], буйных – больш за 100 тыс. жыхароў. Звычайна названы крытэр улічваецца пры вывучэнні дэмаграфічных, сацыяльна-эканамічных, сацыялагічных бакоў урбанізацыі. Прыдатным аказаўся гэты паказчык і пры вывучэнні мемаратыўных практык намінацыі ўнутрыгарадскіх аб’ектаў.

Аналіз урбананіміконаў сярэдніх горадоў Ліда, Мазыр і буйнога горада Віцебск паказаў, што існуючыя ў іх назвы ўнутрыгарадскіх аб’ектаў, якія захоўваюць гістарычную памяць пра асоб і падзеі Вялікай Айчыннай вайны, размеркаваліся па сямі тэматычных групах (табліца).

Супастаўленне пералічаных урбананіміконаў паказала існаванне паміж імі як падабенства, так і пэўных адрозненняў. Падабенства заключаецца ў наяўнасці і колькаснай перавазе ў кожным з гарадоў найменняў вуліц і іншых унутрыгарадскіх аб’ектаў, што фарміруюць шостую, пятую і першую тэматычныя групы (гл. табліцу). Ужо сам гэты факт – сведчанне таго, што дамінуючым прынцыпам рэпрэзентацыі вынікаў Вялікай Айчыннай вайны, якім кіраваліся і кіруюцца члены тапанімічных камісій згаданых гарадоў, з’яўляецца, па-першае, увага да радавых удзельнікаў вайны, герояў бітваў і ахвяр, па-другое, – асоб вышэйшага каманднага складу, па-трэцяе, – войскаў, аб'яднанняў і фарміраванняў, што прымалі ўдзел у абароне / вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Аднак, як паказвае сучасная намінатыўная практыка, шляхі ўзнаўлення элементаў гісторыі намінатарамі сярэдніх, з аднаго боку, і буйных гарадоў – з іншага нярэдка адрозніваюцца. У прыватнасці, гэта выяўляецца ў зняцці акцэнтаў на асобныя тыпы назваў. Так, у рэчышчы ўдасканалення ваенных і сацыяльных тэхналогій з карт сярэдніх, а ў асобных выпадках і буйных, гарадоў знікаюць урбанонімы, асновай для ўтварэння якіх сталі найменні *родаў войскаў* (у Лідзе зафіксаваны два такія ўрбанонімы: *Артиллерийская ул., Артиллерийский пер.*; у Мазыры і Віцебску не выяўлены); *воінскіх званняў і кваліфікацый* (у Мазыры гэта *ул. Зенитчиков*, у Віцебску – *Офицерская ул.*; у Лідзе не зафіксаваны); *найменняў будынкаў, прызначаных для ваенных патрэб* (у буйным горадзе гэта *Пороховая ул.*; у сярэдніх гарадах не выяўлены).

Пры гэтым некаторыя намінацыйныя рашэнні, у прыватнасці, адсутнасць у Мазыры ўнутрыгарадскіх назваў у гонар Дня Перамогі і дня вызвалення гэтага паселішча ад фашыстаў, не адпавядаюць актуальнасці гэтай інфармацыі для жыхароў горада.

Аналіз урбананіміконаў геаграфічна супрацьпастаўленых сярэдніх гарадоў – Ліды і Мазыра – таксама дазваляе канстатаваць, з аднаго боку, падабенства – большасць урбанонімаў утворана ад імёнаў асоб, якія нарадзіліся, жылі і працавалі, абаранялі ці вызвалялі горад гэтага рэгіёна, пахаваны ў ім, або звязаны з падзеямі, што адбываліся падчас вайны ў гэтым рэгіёне; з другога – наступныя адрозненні:

– розную колькасць тэматычных груп урбанонімаў у гонар асоб і падзей Вялікай Айчыннай вайны: у Лідзе – пяць (адсутнічаюць 4-я і 7-я); у Мазыры – чатыры (адсутнічаюць 2-я, 3-я і 7-я);

– розную напаўняльнасць вызначаных тэматычных груп назваў. Так, пятую тэматычную групу назваў у гонар асоб вышэйшага каманднага складу ў г. Ліда фарміруюць 15 урбанонімаў, або 4,1% ад агульнай колькасці назваў вуліц, завулкаў і інш. (*ул. Генерала Беды, ул. Говорова, 1-й пер. Говорова, 2-й пер. Говорова, ул. Доватора, 2-я ул. Доватора, ул. Черняховского* і інш.), у той час як у Мазыры названую групу рэпрэзентуюць толькі 2 урбанонімы, або 1,2% (*ул. Доватора, ул. Ковпака*), што, на нашу думку, сведчыць пра асаблівы піетэт намінатараў заходняга горада да генералітэту Вялікай Перамогі. Што да шостай групы – назваў у гонар радавых удзельнікаў вайны, герояў бітваў і ахвяр, – то тут суадносіны паміж працэнтнымі паказчыкамі і піетэтам намінатараў заходняга

і ўсходняга гарадоў адваротныя: нягледзячы на блізкія лічбавыя паказчыкі (у Лідзе – 40 назваў, у Мазыры – 37), намінатары ўнутрыгарадскіх аб’ектаў усходняга горада ў два разы часцей (у Мазыры такія назвы складаюць 22,9%, у Лідзе – 10,8% ад агульнай колькасці ўрбанонімаў) выкарыстоўвалі імёны радавых удзельнікаў, герояў бітваў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны ў якасці ўтваральнай асновы ўрбанонімаў.

Табліца. – Урбанонімы сярэдніх і буйных беларускіх гарадоў у гонар падзей і асоб Вялікай Айчыннай вайны (% ад агульнай колькасці лінейных аб’ектаў, прыклады назваў)

| Ліда | Віцебск | Мазыр |
|---|---|---|
| 1-я група ***У гонар войскаў, аб'яднанняў і фарміраванняў*** | | |
| **3 – 0,8%**<br>Красноармейская ул., Красноармейский пер., Партизанская ул. | **6 – 0,6%**<br>ул. 39-й Армии; ул. 43-й Армии; 2-я Гвардейская ул., 3-я Гвардейская ул., Партизанский пер., ул. Советской Армии | **1 – 0,6%**<br>Красноармейский пер. |
| 2-я група ***У гонар Дня Перамогі і дзён вызвалення населенага пункта*** | | |
| **1 – 0,3%**<br>просп. Победы | **5 – 0,5%**<br>ул. 26 Июня, пер. 26 Июня, пл. Победы, просп. Победы, ул. Победы | – |
| 3-я група ***У гонар родаў войскаў*** | | |
| **2 – 0,5%**<br>Артиллерийская ул., Артиллерийский пер. | – | – |
| 4-я група ***У гонар воінскіх званняў і кваліфікацый*** | | |
| – | **1 – 0,1%**<br>Офицерская ул. | **1 – 0,6%**<br>ул. Зенитчиков |
| 5-я група ***У гонар асоб вышэйшага каманднага складу*** | | |
| **15 – 4,1%**<br>ул. Генерала Беды, ул. Говорова, 1-й пер. Говорова, 2-й пер. Говорова, ул. Доватора, 2-я ул. Доватора, ул. Черняховского, ул. Брандиса, ул. Ватутина, ул. Веденина, ул. Галицкого, ул. Жукова, ул. Луппова, ул. Щербакова, ул. Осликовского | **22 – 2,2%**<br>ул. Байдукова, ул. Будённого, ул. Ватутина, ул. Генерала Белобородова, просп. Генерала Белобородова, просп. Генерала Людникова, ул. Громова, ул. Доватора, 1-я ул. Доватора, 2-я ул. Доватора, 3-я ул. Доватора, 4-я ул. Доватора, 5-я ул. Доватора, 6-я ул. Доватора, ул. Зайцева, ул. Сивакова, ул. Целикова, просп. Черняховского, ул. Шаврова, ул. Щербакова-Набережная, набережн. Щербакова, пер. Щербакова | **2 – 1,2%**<br>ул. Доватора, ул. Ковпака |
| 6-я група ***У гонар радавых удзельнікаў вайны, герояў бітваў і ахвяр*** | | |
| **40 – 10,8%**<br>ул. Гастелло, 1-й пер. Гастелло, 2-й пер. Гастелло, ул. Малахова, 1-й пер. Малахова, 2-й пер. Малахова, ул. Гареева, ул. Герасимова, ул. Жабинского, ул. Окрестина, пер. Выдайко, ул. Выдайко, ул. Артеменко, ул. Болгарина, ул. Матросова, ул. Ситникова, ул. Труханова, ул. Шевченко, ул. Заслонова, ул. Шубина, ул. Зои Космодемьянской, ул. Игнатова, ул. Кахановича, ул. Качана, ул. Климко, ул. Коннова, ул. Костроминой, ул. Краснодонцев, ул. Кулачёвых, ул. Лизы Чайкиной, ул. Марата Казея, ул. Машерова, ул. Царюка, ул. Фомичева, ул. Наказных, ул. Олега Кошевого, ул. Пролыгина, ул. Притыцкого, ул. Радюка, ул. Рыбиновского | **38 – 3,9%**<br>ул. Белохвостикова, ул. Бирюлина, ул. Веры Хоружей, ул. Виноградовой, ул. Данукалова, ул. Жесткова, ул. Заслонова, пер. Заслонова, 2-я ул. Заслонова, 3-я ул. Заслонова, 4-я ул. Заслонова, ул. Зеньковой, ул. Князева, ул. Кольцова, пер. Кольцова, ул. Кондратьева, ул. Леонова, ул. Маскаева ул. Мясоедова, ул. Софьи Панковой, пер. Софьи Панковой, ул. Портновой, ул. Ромашкина, ул Свечкиных, ул. Свидинского, 1-я ул. Сильницкого, 2-я ул. Сильницкого, 3-я ул. Сильницкого, ул. Сметанина, ул. Смушкевича, ул. Степаненко, ул. Супруна, ул. Шмырёва, ул. Шрадера, ул. Бумагина, ул. Гастелло, ул. Горовца, ул. Григорьева | **37 – 22,9%**<br>ул. Гастелло, ул. Константина Захарова, ул. Катаева, 2-й пер. Катаева, 3-й пер. Катаева, 4-й пер. Катаева, 5-й пер. Катаева, 6-й пер. Катаева, ул. Малинина, пер. Малинина, 1-й пер. Малинина, ул. Александра Матросова, ул. Викентьева К.Ф., ул. Котловца, ул. Нежнова, ул. Нелидова, ул. Освободителей, ул. Притыцкого, ул. Ракицкого, ул. Тихонова, ул. Трусевича, ул. Царенко, ул. Иваненко, ул. Муравьева, ул. Рыжкова, ул. Заслонова, пер. Заслонова, 1-й пер. Заслонова, 2-й пер. Заслонова, 3-й пер. Заслонова, 4-й пер. Заслонова, 5-й пер. Заслонова, ул. Бумажкова, ул. Веры Хоружей, ул. Героев Подполья, ул. Олега Кошевого, ул. Языковича, Партизанский пер. |
| 7-я група ***Па назвах будынкаў, прызначаных для ваенных патрэб*** | | |
| – | **1 – 0,1%**<br>Пороховая ул. | – |
| | | **Усяго** |
| 61 – 16,5% (370 вул.) | 73 – 7,4% (987 вул.) | 41 – 25,5% (161 вул.) |

*Заўвага.* – Прыклады назваў прыводзяцца ў арфаграфіі крыніцы матэрыялу даследавання.

**Заключэнне**. Такім чынам, вынікі праведзенага даследавання дазваляюць заключыць, што:

– захаванне гістарычнай памяці пра вынікі Вялікай Айчыннай вайны ўрбананімнымі сродкамі – адна з умоў выпрацоўкі ўстойлівага імунітэту супраць пагрозы разбурэння сацыяльнай і этнакультурнай ідэнтычнасці беларусаў;

– адрозненні ва ўрбананіміконах розных гарадоў абумоўлены рэгіянальна;

– ва ўрбананіміконах сярэдніх гарадоў адзначаецца прыярытэт рэгіянальнага, або мясцовага (назваў у гонар асоб і падзей гісторыі гэтага паселішча, ці, па-іншаму, малой Радзімы) перад агульнанацыянальным, што заклікана падкрэсліць самабытнасць гісторыі канкрэтнага горада як складніка гісторыі Беларусі;

– сучасныя намінацыйныя практыкі дэманструюць падвышаны піетэт намінатараў заходняга сярэдняга горада да асоб генералітэту Вялікай Перамогі; намінатараў усходняга сярэдняга горада – да асоб радавых удзельнікаў вайны, герояў бітваў і ахвяр.

Выкладзенае патрабуе падкрэсліць, што аналізаваная частка ўрбананімнай спадчыны тэрыторыі служыць важкай падставай для захавання гістарычнай памяці пра Вялікую Айчынную вайну.

ЛІТАРАТУРА

1. Абдулаева Э.С., Курбанова Л.У. Меморизация событий как способ влияния на общественное сознание [Электронный ресурс] // URL: https://cyberleninka.ru/article/n/memorizatsiya-sobytiy-kak-sposob-vliyaniya-na-obschestvennoe-soznanie/viewer (дата обращения: 03.05.2025).
2. Дорофеенко М.Л. Отражение исторической памяти в урбанонимных меморативах: сопоставительный аспект // Вести Белорус. гос. педагог. ун-та. Сер. 1. Педагогика. Психология. Филология. – 2023. – № 4(118). – С. 109–111.
3. Дорофеенко М.Л. Урбанонимы Беларуси и Франции, отражающие физико-географические особенности местности // Весн. Мазыр. дзярж. педаг. ун-та ім. І.П. Шамякіна. – 2024. – № 1(63). – С. 143–148.
4. Мезенко А.М. Мемориальные урбанонимы как трансляторы исторической памяти народа // Наука – образованию, производству, экономике: материалы 74-й Регион. науч.-практ. конф. преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 18 февр. 2022 г. / Витеб. гос. ун-т; редкол.: Е.Я. Аршанский (гл. ред.). – Витебск: ВГУ им. П. М. Машерова, 2022. – С. 198–201.
5. Попов С.А. Память о Великой Отечественной войне в названиях улиц населенных пунктов Воронежской области // Ономастика Поволжья: материалы XXI Междунар. науч. конф., Рязань, 3–5 окт. 2023 г. / под общ. ред. И.Н. Хрусталѐва, В.И. Супруна. – Рязань: Рязан. гос. ун-т им. С.А. Есенина, 2023. – С. 204–208.
6. Савина А.В. Памятники Белозерска: меморизация в малом историческом городе [Электронный ресурс] // X Кирилло-Новоезерские чтения: сб. ст. межрегион. конф. / Под ред. Т.А. Москаленко, С.А. Удальцовой. – Белозерск: БУК ВО «Белозерский областной краеведческий музей», 2020. – С. 371–382. – URL: https://belozermus.ru/blog/sbornik-materialov-mezhregionalnoy-konferencii-x-kirillo-novoezerskie-chteniya-nauchnoe (дата обращения: 11.12.2024).
7. Красовская Н.А. Топонимы в региональной прессе военного периода // Ономастика Поволжья: материалы XXI Междунар. науч. конф., Рязань, 3–5 окт. 2023 г. / Под общ. ред. И.Н. Хрусталѐва, В.И. Супруна. – Рязань: Рязан. гос. ун-т им. С.А. Есенина, 2023. – С. 127–130.
8 Орлова Е.О. Годонимы и памятники в честь героев Великой Отечественной войны: действие/бездействие исторической памяти // Ономастика Поволжья: материалы XXI Междунар. науч. конф., Рязань, 3–5 окт. 2023 г. / Под общ. ред. И.Н. Хрусталѐва, В.И. Супруна. – Рязань: Рязан. гос. ун-т им. С.А. Есенина, 2023. – С. 190–195.
9. Ружицкий Б. Переименование городской топонимии как средство переопределения местной идентичности: декоммунизация названий улиц в Польше // Городские исследования и практики. – 2021. – Т. 6, № 1. – С. 109–123. DOI: https://doi.org/10.17323/usp612021109-123.
10. Борисенко В.Н., Венглож Я., Гончарова Т. Н. Вторая мировая война в исторической памяти русских и поляков: перекрестный взгляд молодых исследователей // Вестн. С.-Петерб. ун-та. Сер. 2. История. – 2016. – Вып. 2. – С. 161–167. DOI: https://doi.org/10.21638/11701/spbu02.2016.214.
11. Дорофеенко М.Л. Архитектурные ориентиры в урбанонимном пространстве Беларуси и Франции // Ученые записки УО "ВГУ им. П. М. Машерова": сб. науч. тр. – 2024. – Т. 39. – С. 116–120.
12. Мезенко А.М. Региональный ономастикон и белорусские лексикографические издания: представленность, векторы развития // Громовские чтения: сб. материалов и исслед. междунар. науч. конф., Кострома, 15–16 сент. 2022 г. – Вып. 4.: Проблемы современной региональной лексикографии: К 100-летию со дня рождения А.В. Громова и 30-летию «Льняного словаря». – Кострома: Костром. гос. ун-т, 2023. – С. 111–117.
13. Численность населения на 1 января 2025 г. и среднегодовая численность населения за 2024 год по Республике Беларусь в разрезе областей, районов, городов, поселков городского типа [Электронный ресурс]. – URL: https://www.belstat.gov.by/ (дата обращения: 03.05.2025).
14. Семёнов-Тян-Шанский В.П. Город и деревня в европейской России: очерк по экономической географии. – СПб.: Тип. В.Ф. Киршбаума, 1910. – 212 с.
15. Хорев Б.С. Проблемы городов (Урбанизация и единая система расселения в СССР). – М., 1975. – 355 с.
16. Смирнов И.П. Средние города Центральной России. – Тверь: Твер. гос. ун-т, 2019. – 165 с.

*Паступіў 17.05.2025*

## ОСОБЕННОСТИ ЭКСПЛИКАЦИИ РЕЗУЛЬТАТОВ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ В УРБАНОНИМИКОНАХ СРЕДНИХ ГОРОДОВ БЕЛАРУСИ

***д-р филол. наук, проф. А.М. МЕЗЕНКО***
***(Витебский государственный университет имени П.М. Машерова)***

*К 80-летию Победы в Великой Отечественной войне в статье отражены результаты сопоставительного изучения урбанонимиконов средних и крупных городов – Лиды, выбранной площадкой для празднования Дня белорусской письменности в 2025 г., Мозыря, Витебска. Установлено три из семи общих для анализированных урбанонимиконов трех городов тематические группы номинативных единиц – наименования внутригородских линейных и территориальных объектов, данные в честь рядовых участников войны, героев битв и жерств; особ высшего командного состава; войск, объединений и формирований. Выявлено, что каждому урбанонимикону свойственны свои соотношения между наименованиями, эксплуатирующими результаты Великой Отечественной войны; при этом средние по количеству населения города характеризуются значительно большим процентом названий анализированных групп (в Мозыре – 25,5%, или 41; в Лиде – 16,6%, или 61) по сравнению с крупными (в Витебске – 7,4%, или 73), что свидетельствует о преобладании в номинативной практике этого разряда городов региональной составляющей над общенациональной.*

***Ключевые слова:*** *крупный / средний город, Великая Отечественная война, Витебск, Лида, Мозырь, внутригородское название, урбанонимикон.*

## FEATURES OF EXPLICATION OF THE RESULTS OF THE GREAT PATRIOTIC WAR IN THE URBANONYMICONS OF MEDIUM-SIZED CITIES OF BELARUS

***G. MEZENKA***
***(Vitebsk State University named after P.M. Masherov)***

*To the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War, the article reflects the results of a comparative study of the urbanonymicons of medium-sized and large Belarusian cities – Lida, chosen as the venue for the celebration of Belarusian Written Language Day in 2025, Mazyr, Vitsiebsk. Three of the seven thematic groups of nominative units common to the analyzed urbanonymicons of the three cities were identified – names of intra-city linear and territorial objects, given in honor of ordinary participants of the war, heroes of battles and victims; officers of the highest command; troops, units and formations. It was determined that each urbanonymicon has its own relationship between the names that explain the results of the Great Patriotic War; at the same time, medium-sized cities in terms of population are characterized by a much higher percentage of names of the analyzed groups (in Mazyr – 25.5%, or 41; in Lida – 16.6%, or 61) compared to large ones (in Vitebsk – 7.4%, or 73), which indicates the dominance of the regional component over the national one in the nominative practice of this category of cities.*

***Keywords****: large / medium-sized city, The Great Patriotic War, Vitsiebsk, Lida, Mazyr, intra-city name, urbanonymicon.*